УДК 821.161.3-17*Н. Гілевіч

А. С. Дзядкова

Навук. кір. – Т. А. Фіцнер, канд. філал. навук, дацэнт

# СПЕЦЫФІКА САТЫРЫЧНАЙ І ГУМАРЫСТЫЧНАЙ ЖАНРАВАЙ ФОРМЫ Ў ТВОРАХ НІЛА ГІЛЕВІЧА

Дадзены артыкул прысвечаны разгляду творчай гумарыстычнай і сатырычнай спадчыны Ніла Гілевіча. Мэтай працы з‶яўляецца вызначэнне спецыфікі жанравых форм сатырычных і гумарыстычных твораў паэта. На падставе праведзенага даследавання было выяўлена, што аўтар у сваѐй паэзіі выкарыстоўваў шматлікія жанры, такія як замовы, пародыі, эпіграмы, казкі, прыпеўкі і інш. У артыкуле падаецца характарыстыка і аналіз кожнай жанравай адзінкі на прыкладах абраных твораў Ніла Гілевіча.

Жанр – гістарычна акрэслены, адносна ўстойлівы тып мастацкай формы, дзе структура пэўных фармальных прыкмет (архітэктанічных, вобразных, моўных) выяўляе больш-менш канкрэтны мастацкі сэнс [1, с. 65]. У літаратуры існуюць такія літаратурныя роды як лірыка, эпас і драма. Кожны з іх мае свае літаратурныя жанры. На працягу 45 некалькіх стагоддзяў паміж даследчыкамі вядуцца спрэчкі наконт таго, да якога роду літаратуры адносяцца гумарыстычныя і сатырычныя творы. Адна частка літаратуразнаўцаў лічыць, што гэтыя творы маюць прыкметы лірыкі, таму адносяць іх менавіта да гэтага роду літаратуры. Другая частка прыйшла да высновы, што некаторыя сатырычныя і гумарыстычныя творы выяўляюць рысы і асаблівасці, якія пэўным чынам набліжаюць іх да лірыкі, эпасу, а іншым разам да драмы ці ліра-эпасу. Некаторыя даследчыкі лічаць, што такія творы не маюць прыкмет ні лірыкі, ні эпасу, ні драмы і бачаць у іх своеасаблівую форму адлюстравання чалавечага жыцця, таму вылучаюць сатыру як асобны род літаратуры. Ніл Гілевіч зарэкамендаваў сябе як агульнапрызнаны выдатны майстар, які даволі паспяхова на працягу ўсѐй сваѐй літаратурнай творчай дзейнасці распрацоўваў жанр ліра-сатырычнага верша, які ў беларускай літаратуры з‘явіўся і замацаваўся даволі даўно і мае свае даўнія традыцыі. У такіх вершах, як «Верабей», «Шпак», «У завіруху» пісьменнік здзекліва высмейвае людзей, якія не адпавядаюць высокім гуманістычным ідэалам, ідэйнасці; тых, у каго няма пачуцця грамадзянскасці ў барацьбе з адмоўнымі з‘явамі жыцця. Варта адзначыць, што ў паэзіі Н. Гілевіча побач з ліра-сатырычнымі вершамі пастаянна з‘яўляюцца «чыста» сатырычныя творы: «Конік у палоне», «Першы канцэрт», «Ракета-самакат» і інш. Аб сацыяльна небяспечных і шкодных заганах, такіх як бюракратызм, раскрадальніцтва, дзяляцтва, махлярства пісьменнік таксама піша ў сваіх казках, фельетонах, байках, прытчах. Кепскія з‘явы чалавечага жыцця адлюстраваны ў шматлікіх жанравых формах: жартах, анекдотах, рыфмах-забавах, пародыях, эпіграмах, прыпеўках. Сатырычныя і гумарыстычныя творы Н. Гілевіча вызначаюцца жанравай і стылѐвай мнагастайнасцю. Ёсць і такія жанравыя формы, якія сустракаюцца ўпершыню ў Ніла Гілевіча. Так, напрыклад, верш «Аматар прыроды» па кампазіцыйнай структуры нагадвае сатырычную хроніку. У ѐй пісьменнік выступае супраць браканьераў і браканьерства. А ў сатыры «Кантора» паэт выкарыстоўвае форму фальклорнай ланцужковай казкі. Тут Ніл Гілевіч выступае як наватар у беларускай літаратуры. Ніл Гілевіч заўсѐды знаходзіўся ў пошуках новых сродкаў выразнасці сатыры, таму спрабуе мадыфікаваць і трансфармаваць ужо вядомыя ў вуснай народнай творчасці жанравыя формы. Так, у зборнік «Да новых венікаў» уключаны раздзел, які складаюць сучасныя замовы-загаворы. Замова – гэта своеасаблівая славесная Литературоведение 46 формула, якая паводле прымхлівых уяўленняў мае магічную сілу – здольная абавязкова ўздзейнічаць у пажаданым кірунку на знешні свет [2, с. 108]. Замовы ўзніклі на аснове веры ў магічную сілу пэўных дзеянняў і слоў. Яны ўзніклі тады, калі чалавек адухаўляў і шанаваў прыроду. Замовы як жанр маюць гаспадарчую аснову ўзнікнення. Ім надавалася таямнічасць і ўрачыстасць. Што да замоў Ніла Гілевіча, то камізм дасягаецца неадпаведнасцю адзнак жанравай формы і зместу. У пісьменніка шмат замоў на розныя тэмы і рознага зместу: «Замова ад рэнегацтва», «Замова ад

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

хабарніцтва», «Замова ад нізкапаклонства», «Замова ад балбатні». Ёсць і «Замова ад хваробы рук у крытыка-аглабельшчыка», «Замова ад рэдактарскага алоўка» і інш. У «Замове ад тупасці, каб не страціць пасаду» «герой» заклікае звышнатуральную магічную сілу дапамагчы яму ўтрымацца на сваім месцы, застацца на сваѐй пасадзе, а для гэтага просіць укласці «ў галаву … глуздоў хоць крышку» [3, с. 46], бо працуе ѐн ужо каля трыццаці год, а глуздоў засталося «грам пятнаццаць» [3, с. 46], ды і тыя можа ўжо заплеснелі ці зацвілі. «Герой», які просіць вышэйшыя сілы абараніць яго ад выкрыцця вонкава, характарызуецца шляхам самавыкрыцця. Такая камічная сітуацыя прызначана для таго, каб сваім смехам пакараць сацыяльна і грамадска небяспечныя людскія заганы. «Герой» «Замовы ад хабарніцтва» просіць «месяц і зоры» дапамагчы яму ў «цяжкім горы». Увесь час яго мучыць сверб: «Свярбіць мая лапа – хоць адрэж» [3, с. 50], а ўсѐ таму што ѐн займаецца хабарніцтвам. І пакуль яму не пакладуць грошай, ѐн нічога не можа зрабіць: «Ні даведку выдаць, ні рэзалюцыю накласці» [3, с. 50]. Ён просіць выратаваць яго з такога няшчасця. Такім чынам, аўтар з дапамогай гнеўнага смеху зрывае маскі з рознага роду хабарнікаў і махляроў, якіх з лѐгкасцю можна назваць адкідамі грамадства. Адной з самых складаных жанравых форм у сатыры Ніл Гілевіч лічыць байку, таму ў яго творчай спадчыне іх адносна невялікая колькасць у параўнанні з тым жа Кандратам Крапівой. У сваѐй байцыпародыі «Жырафа і цюлень» паэт распавядае пра «любоў» Цюленя да Жырафы. Цюлень пакляўся перад богам, што ѐн закахаўся і хоча ажаніцца з Жырафай. Яна яму паверыла і прывяла да сябе ў хату. Але ў Цюленя з самага пачатку былі нядобрыя намеры, таму ѐн без усялякага сораму ашуквае яе і ўцякае. Сатырык, такім чынам, падкрэслівае надуманасць сюжэтнай сітуацыі і вобразаў. У байцы «Вераб'іныя госці» пад гасцямі Ніл Гілевіч малюе вобразы прыстасаванцаў, злодзеяў і хапуг. Дзеянне разварочваецца 47 вакол Вераб'я, які пабудаваў сабе дачу не па сродках. І тут паўстае пытанне, каго запрасіць у госці на наваселле. Верабей адмаўляецца запрашаць Зябліка, хоць ѐн і раднѐй яму прыходзіцца, а Вось Пугача, Сыча і Крумкача з вялікай ахвотай запрашае, бо без іх пячатак і подпісаў не было б і дачы. Паэт псіхалагічна малюе ў вобразах птушак знаѐмыя тыпы «двуногіх драпежнікаў». Такім чынам, Верабей не запрасіў да сябе ніводнага сябра, сваяка, а толькі тых, хто хоць якім-небудзь бокам спрычыніўся да пабудовы дачы. У нядзелю Верабей з радасцю і павагай сустракае шаноўных гасцей, але весялосць хутка скончылася, таму што Арол прынѐс павестку: «Вераб'ю з'явіцца ў суд» [3, с. 86]. Усе ганарлівыя і фанабэрлівыя хаўруснікі па махінацыях палохаюцца і разбягаюцца ў розныя бакі, як толькі пра гэта даведваюцца. Замест ветлівага развітання бедны Верабей толькі і пачуў: «Дык ты што? Хацеў каб я // Піў са злодзеем гарэлку?..» [3, с. 86]. Ніл Гілевіч час ад часу імкнуўся да нечага новага. Таму звярнуў сваю ўвагу на неасвоены беларускай літаратурай жанр і напісаў паэму-камедыю «Формула іржавіны». Гэты твор называўся парознаму: «Восем чалавек на адно месца», «Формула годнасці», «Формула іржавіны». У рэшце рэшт замацавалася апошняя назва, бо яна, у параўнанні з іншымі, унесла сатырычнае адценне твору. Іржавіна тут не хімічнае злучэнне, а гэта кепскія з'явы ў сацыяльнамаральнай формуле, якія не адпавядаюць законам і нормам нашага жыцця. Твор закрануў разнастайныя пытанні, адказы на якія можна знайсці ў паэме-камедыі «Формула іржавіны», якая адказвае на іх са знішчальным смехам. Праз камічныя сітуацыі аўтар паказвае сацыяльныя тыпы. Змест паэмы знешне просты і жыццѐва праўдзівы. Аўтар надзяляе сваіх герояў індывідуальнымі рысамі ў плане выяўлення маральных і сацыяльных прыкмет, якія і заключаюць галоўны змест камедыі. Сутыкаюцца паміж сабой розныя, нават процілеглыя прынцыпы. Гэта з'яўляецца асноўным канфліктам камедыі. За выказваннямі герояў паэмы-камедыі заўсѐды чуецца публіцыстычна яркі, сатырычна знішчальны, грамадзянска ўзвышаны голас аўтараапавядальніка, які глядзіць на тагачасныя праблемы са свайго сучаснага боку. Падводзячы вынікі, можна адзначыць, што Ніл Гілевіч не спыняўся і не засяроджваў увагу толькі на адной жанравай форме, ѐн заўсѐды імкнуўся наперад, спрабаваў увесці штосьці новае, знаходзіўся ў пошуку новых ідэйна-эстэтычных узроўняў. Некаторыя наватарскія творы паэта прыводзілі крытыкаў да супярэчлівых Литературоведение 48 поглядаў, аднак, нягледзячы на гэта, творы Ніла Гілевіча ўспрымаліся чытачамі лѐгка і проста.

Спіс літаратуры 1 Рагойша, В. П. Літаратуразнаўчы слоўнік: тэрміны і паняцці: для школьнікаў і абітурыентаў / В. П. Рагойша. –

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

Мінск: Народная асвета, 2009. – 221 с. 2 Беларуская вусна-паэтычная творчасць: падруч. для філал. спец. ВНУ / К. Кабашнікаў, А. С. Фядосік, А. С. Ліс і інш. – 2-е выд., перапрац. – Мінск: «Вышэйшая школа», 1988. – 415 с. 3 Гілевіч, Н. С. Выбраныя творы: у 2 т. Т. 2. Гумар і сатыра; Творы для дзяцей / Н. С. Гілевіч. – Мінск: Маст. літ., 1981. – 366 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ